# ДАСЛЕДАВАННЕ ІНВАЛІДНАСЦІ МЕТАДАМ ЭКСПЕРТНАГА АПЫТАННЯ

**І. В. Пархоменка**

Вялікая роля ў вывучэнні феномену «інваліднасць» належыць сацыялогіі. Менавіта даследаванне дадзенага праблемнага поля сацыялагічнымі метадамі дазваляе не толькі рабіць дыягностыку стану праблемы, але і вывучаць грамадскую думку адносна фактараў, якія ўплываюць на ўзнікненне, стан праблемы і яе рашэнне, а таксама канструяваць прагноз развіцця сітуацыі ў будучыні.

Распрацоўка методыкі і тэхнікі правядзення даследчай працы па вывучэнню сацыяльнага феномену «інваліднасць» прадугледжвае аптымізацыю дзейнасці ў двух накірунках: 1. Распрацоўка тэарэтыка-метадалагічнай часткі праграм сацыялагічных даследаванняў гэтага феномену, што прадугледжвае працу па аперацыяналізацыі, інтэрпрэтацыі ключавых паняццяў і груп фактараў, якія абумоўліваюць узнікненне праблемы. 2. Абгрунтаванне выбару метадаў сацыялагічнага даследавання і складанне інструментарыя.

З мэтай больш глыбокага аналізу феномену «інваліднасць» у лютым-сакавіку 2006 года па гэтай тэме было праведзена сацыялагічнае даследаванне метадам экспертнага апытання. Агульная колькасць апытаных экспертаў склала 20 чалавек. Выбар дадзенага метаду абгрунтоўваецца тым, што ён дазваляе атрымаць найбольш каштоўныя звесткі па праблеме ад кампетэнтных у гэтай сферы людзей, выявіць глыбінную сутнасць праблемы і на аснове атрыманых звестак выпрацаваць рэкамендацыі па яе вырашэнню. Вартасць выкарыстання менавіта гэтага даследчага метаду абгрунтоўваецца яшчэ і тым, што феномен інваліднасці ў Беларусі амаль не вывучаўся з пазіцыі сацыялогіі і таму перш, чым падысці да яго маштабнага вывучэння шляхам правядзення масавых апытанняў, варта правесці апытанне экспертаў і праз гэта глыбей разабрацца ў сутнасці самой праблемы.

Аналізуючы праблемы інвалідаў, амаль усе эксперты падкрэслівалі ў сваіх інтэрв'ю, што асноўным негатыўным фактарам у гэтым з'яўляецца стаўленне грамадства да інвалідаў, яго неразуменне, незацікаўленасць у вырашэнні праблем людзей з абмежаванымі фізічнымі і псіхічнымі магчымасцямі. Таму асноўнай праблемай, якую трэба найперш вырашаць, з'яўляецца праблема грамадскіх адносінаў паміж катэгорыямі "інваліды" і «астатнія людзі». На другім месцы, на думку экспертаў, стаіць праблема працаўладкавання інвалідаў і звязаная з гэтым праблема іх перанавучання, прафесійнай рэабілітацыі. Далей ідуць праблемы пра-

вавой абароны інвалідаў, іх інфармацыйнай падтрымкі, праблемы сацыяльна-бытавога абслугоўвання і фінансава-матэрыяльнай падтрымкі.

Эксперты адзначалі, што ўсе вышэй прыведзеныя праблемы непасрэдна звязаны адна з адной, і іх неабходна вырашаць у комплексе. Так, напрыклад, вырашэнне матэрыяльна-фінансавых праблем магчыма толькі праз вырашэнне праблем працаўладкавання інвалідаў, а апошнія ў сваю чаргу вырашаюцца праз навучанне і перанавучанне. Усё гэта грунтуецца на створанай заканадаўчай базе па праблемах інвалідаў, якую большасць экспертаў лічаць дастаткова дасканалай, але пры гэтым яны вельмі негатыўна ацэньваюць якасць выканання ў нашай краіне заканадаўчых норм у дачыненні да інвалідаў. Большая частка апытаных экспертаў таксама ўказвала на існуючую праблему прававой дыскрымінацыі інвалідаў, хаця ні ў адным заканадаўчым акце Беларусі не прапісана, што гэта такое.

Пры аналізе эфектыўнасці сацыяльнай палітыкі ў працы з інвалідамі большасць экспертаў далі дастаткова нізкія ацэнкі амаль кожнаму з яе накірункаў. Трынаццаць з чатырнаццаці разгледжаных накірункаў сацыяльнай палітыкі большая палова экспертаў ацаніла як малаэфектыўныя ці недастаткова эфектыўныя. Горш за ўсё эксперты ацанілі якасць інфармацыйнага забеспячэння інвалідаў; 12 чалавек ахарактарызавалі працу дзяржавы і іншых структур ў гэтым накірунку як малаэфектыўную і яшчэ 6 – як недастаткова эфектыўную. Больш за ўсё, на думку экспертаў, інвалідам неабходна прававая інфармацыя, інфармацыя бытавога плану (дзе якія паслугі можна атрымаць) і інфармацыя аб тых праектах і праграмах для інвалідаў, якія рэалізуюцца на сённяшні дзень.

Таксама дастаткова нізкія ацэнкі эфектыўнасці сярод экспертаў атрымалі накірункі фінансава-матэрыяльнай і ільготнай дапамогі інвалідам, прававая абарона, сацыяльна-бытавое абслугоўванне, прафесійная, працоўная і псіхалагічная рэабілітацыя. Больш пазітыўныя ацэнкі (гэта значыць, што экспертамі былі адзначаны істотныя зрухі ў лепшы бок) атрымалі такія накірункі сацыяльнай палітыкі, як арганізацыя культурных і спартыўных мерапрыемстваў, медыцынская рэабілітацыя, стварэнне «безбар'ернага асяроддзя».

Па выніках даследавання было зроблена падрабязнае апісанне праблем інвалідаў у розных сферах і складзены спіс з 90 рэкамендацый, прапанаваных экспертамі для паляпшэння сацыяльнага гэтай групы насельніцтва.